Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па навуковай рабоце
БДУКМ
______________ В. Р. Языковіч
«___» _____________ 2019 г.
Рэгістрацыйны № ВД-_____/вуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНАЯ РЭАБІЛІТАЦЫЯ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-23 01 14 Сацыяльна-культурная дзейнасць*

2019

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарту ОСВО 1-23 01 14 Сацыяльна-культурная дзейнасць і вучэбнага плана па спецыяльнасці 1-23 01 14 Сацыяльна-культурная дзейнасць; рэг.№ Е23-1-75/17 вуч. ад 04.07.2017

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**

*А. А. Корбут,* прафесар кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт;

*В. У. Рагачова,* дацэнт кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт;

*Н. В. Сівіцкая,* дацэнт кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук;

*Н. С. Пракаповіч,* выкладчык кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*Ю. У. Міцкевіч,* дацэнт кафедры міжкультурных камунікацый установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт;

*А. І. Навуменка,* дацэнт кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін установы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія авіяцыі», кандыдат эканамічных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

кафедрай педагогікі сацыякультурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 3 ад 16.10.2018);

прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 2 ад 19.12.2018)

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: В. У. Рагачова

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма дысцыпліны «Сацыяльна-культурная рэабілітацыя» распрацавана для вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 1-23 01 14 Сацыяльна-культурная дзейнасць. Прапанаваная праграма з'яўляецца лагічным працягненнем і паглыбленнем ведаў, атрыманых студэнтамі ў выніку авалодання такімі дысцыплінамі, як «Педагогіка і псіхалогія», «Тэхналогіі сацыяльна-культурнай дзейнасці» і інш.

Вучэбная дысцыпліна займае вядучае месца ў прафесійнай падрыхтоўцы спецыялістаў сацыяльна-культурнай дзейнасці. Гуманістычны кірунак у сацыяльна-культурнай дзейнасці разглядаецца як тэндэнцыя, якая патрабуе свабоды думкі і талерантнасці, адмаўлення ад стандартызацыі і ўніфікацыі сацыяльнай дапамогі насельніцтву, рознабаковасці яе зместу. У гуманістычных тэорыях і сістэмах развіцця на першае месца выходзіць асоба і яе патрабаванні. Выкарыстанне асноўных палажэнняў гуманістычнага выхавання пашырае сферу задач сацыяльных педагогаў і спецыялістаў сацыяльна-культурнай сферы. Галоўнае ў гэтых палажэннях – развіццё ўнутранага «Я» кожнага чалавека, яго творчай самарэалізацыі. Таму роля арганізатара сацыяльна-культурнай дзейнасці (далей СКД) праяўляецца ў тым, каб дапамагчы кожнаму індывіду развіць сваю мову самавыражэння. Сродкам, які здольны дапамагчы ў вырашэнні гэтых задач, з'яўляецца сацыякультурная дзейнасць і яе рэабілітацыйныя магчымасці.Паляпшэнне рэабілітацыйнай работы з асобай залежыць ад псіхолага-педагагічнага фактару, ад узроўню ўмоў жыцця, камфортнага асяроддзя, спрыяючых умоў для самаадчування і самазахавання. Між тым, значнай колькасці людзей, якім уласціва разгубленасць і трывога, неабходна дапамога арганізатара СКД.

*Асноўная мэта* вывучэння вучэбнай дысцыпліны – навучыць студэнтаў розным прыёмам рэабілітацыйнага ўздзеяння на фарміраванне і развіццё асобы, яе самарэалізацыі.

Патрабаванні да ўзроўню засваення зместу дысцыпліны «Сацыяльна-культурная рэабілітацыя» вызначаны адукацыйнымі стандартамі вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці «Сацыяль-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

на-культурная дзейнасць», дзе акрэслены мінімум зместу па дысцыпліне ў выглядзе сістэмы абагульненых ведаў і навыкаў, ствараючых прафесійную кампетэнтнасць выпускніка УВА.

Пасля вывучэння дадзенай вучэбнай дысцыпліны студэнты павінны *ведаць:*

– асноўныя паняцці, мэты і задачы сацыяльна-культурнай рэабілітацыі;

– асноўныя прынцыпы сацыяльна-культурнай рэабілітацыі;

– змест і асноўныя кампаненты дзейнасці арганізатара сацыяльна-культурнай дзейнасці па сацыяльна-культурнай рэабілітацыі.

Студэнты павінны *ўмець*:

– выяўляць асноўныя прычыны дэфармацыі развіцця асобы;

– выкарыстоўваць розныя віды мастацтва ў працэсе правядзення рэабілітацыйнай работы;

– выкарыстоўваць метады сацыяльна-культурнай рэабілітацыі ў прафесійнай дзейнасці спецыяліста сацыяльна-культурнай дзейнасці.

Студэнты павінны *валодаць:*

– дыягнастычнымі метадамі, накіраванымі на выяўленне прычын дэфармацыі развіцця асобы;

– навыкамі распрацоўкі рэабілітацыйных праграм з улікам дыферэнцыраванага падыходу да розных груп насельніцтва;

– спецыфічнымі асобаснымі якасцямі, неабходнымі для ажыццяўлення рэабілітацыйнай работы.

Згодна з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту пасля завяршэння навучання ва ўстанове вышэйшай адукацыі спецыяліст сацыяльна-культурнай сферы павінен валодаць акадэмічнымі, сацыяльна-асобаснымі і прафесійнымі кампетэнцыямі.

АК – 2. Валодаць сістэмным і параўнальным аналізам.

АК – 3. Валодаць даследчымі навыкамі.

АК – 6. Валодаць міждысцыплінарным падыходам да вырашэння рэабілітацыйных праблем.

САК – 2. Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння.

САК – 4. Валодаць навыкамі здаровага ладу жыцця.

САК – 7. Быць здольным да ўзаемадзеяння, супрацоўніцтва, разумнага кампрамісу падчас вырашэння рэабілітацыйных задач.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ПК – 1. Далучаць розныя групы насельніцтва і асобных індывідаў да працэсу стварэння, засваення, зберажэння і распаўсюджвання каштоўнасцей культуры.

ПК – 7. Арганізоўваць інфармацыйна-асветніцкую і выхаваўчую работу па месцажыхарстве.

ПК – 10. Прагназаваць, планаваць і арганізоўваць інавацыйна-метадычную і мастацка-творчую дзейнасць у сферы культуры і мастацтваў.

ПК – 11. Выяўляць інтарэсы і педагагічныя патрэбы насельніцтва ў розных відах вольнага часу.

Заняткі праходзяць у форме лекцый і практычных заняткаў. Значнае месца надаецца самастойнай рабоце, што дазволіць студэнтам набыць неабходныя навыкі ў арганізацыі рэабілітацыйнай дзейнасці, накіраванай на дапамогу розным групам насельніцтва.

Згодна з мэтай і задачамі вучэбнай дадзенай дысцыпліны асноўнымі метадамі (тэхналогіямі) навучання з'яўляюцца: праблемнае навучанне (часткова пошукавы і даследчыя метады); інтэрактыўныя тэхналогіі, заснаваныя на актыўных формах і метадах навучання; камунікатыўныя тэхналогіі (трэнінг, майстар-клас і інш.).

Вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны «Сацыяльна-культурная рэабілітацыя» адведзена ўсяго 174 гадзіны, з іх 104 – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 20, лабараторныя – 84. Рэкамендаваная форма кантролю – залік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Раздзел 1. Арт-тэрапія

### *Тэма 1. Тэарэтычныя асновы сацыяльна-культурнай рэабілітацыі*

Змест паняццяў «сацыяльна-культурная рэабілітацыя», «аб’ект сацыяльна-культурнай рэабілітацыі», «тэхналогіі сацыяльна-культурнай рэабілітацыі». Характарыстыка асноўных рэабілітацыйных механізмаў: адаптацыя, сацыялізацыя, інкультурацыя і інш. Змест асноўных кампанентаў сацыяльна-культурнай рэабілітацыі. Прынцыпы сацыяльна-культурнай рэабілітацыі. Змест сучасных сацыяльна-культурных рэабілітацыйных тэхналогій.

### *Тэма 2. Арт-тэрапеўтычныя тэхналогіі ў сістэме сацыяльна-культурнай рэабілітацыі. Асноўныя паняцці, мэты і задачы арт-тэрапіі*

Перадумовы развіцця арт-тэрапіі: першабытнае мастацтва, дзіцячая творчасць, традыцыі класіцызму і рамантызму, творчасць псіхічна хворых людзей. Асаблівасці развіцця арт-тэрапіі ў ЗША: развіццё арт-псіхатэрапіі і арт-педагогікі. Станаўленне арт-тэрапіі ў Вялікабрытаніі. Праца А. Хіла і інш. Стварэнне першых прафесійных аб’яднанняў і дзяржаўнае прызнанне арт-тэрапіі.

Сучаснае паняцце і сутнасць арт-тэрапіі. Арт-тэрапія ў іерархіі кірункаў на аснове мастацтва і творчай дзейнасці. Асноўныя віды і функцыі арт-тэрапіі. Перавагі арт-тэрапіі ў параўнанні з іншымі відамі тэрапіі. Характарыстыка асноўных форм арт-тэрапіі. Віды групавой арт-тэрапіі. Класіфікацыя арт-тэрапеўтычных матэрыялаў.

### *Тэма 3. Арганізацыя арт-тэрапеўтычнай работы спецыялістамі сацыяльна-культурнай дзейнасці*

Характарыстыка фактараў псіхатэрапеўтычнага ўздзеяння ў арт-тэрапіі. Асноўныя этапы арт-тэрапеўтычнага працэсу. Мадэль арт-тэрапеўтычнай сесіі. Арганізацыя прасторы арт-тэрапеўтычнага працэсу. Арганізацыйныя працэдуры і формы арт-тэрапіі. Дыягнастычныя падыходы да вывучэння асобы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сродкамі арт-тэрапіі. Тэхнікі арт-тэрапіі: калаж, фататэрапія, скрапбукінг і інш.

## Раздзел 2. Драматэрапія

### *Тэма 4. Драматэрапія ў кантэксце сацыяльна-культурнай рэабілітацыі*

Асноўныя формы і інструменты драматэрапіі. Прастора драматэрапіі. Структура драмапраекта. Этапы работы над драмапраектам. Маска ў драматэрапіі. Імправізацыя ў драматэрапіі. Запланаваная, незапланаваная імправізацыя і экспромт. Маска і лялька ў драматэрапіі. Тэхналогія стварэння маскі для драмапраекта. Тэхнікі работы з лялькай у драматэрапіі. Індывідуальная і групавая драматэрапія.

### *Тэма 5. Казкатэрапія і «storytelling» у рабоце спецыяліста сацыяльна-культурнай дзейнасці з рознымі катэгорыямі насельніцтва*

Казка як інструмент псіхадыягностыкі. Архетыпы ў казках і міфах. Віды казак і іх выкарыстанне ў сацыякультурнай рэабілітацыі. Адпрацоўка методык «Калектыўная казка», «Ліст у будучыню», «Гісторыя майго жыцця». Стварэнне і выкарыстанне тэрапеўтычных казак.

## Раздзел 3. Гульнятэрапія

### *Тэма 6. З гісторыі гульнятэрапіі. Агульная характарыстыка гульнятэрапіі як сродку сацыякультурнай рэабілітацыі*

Паняцце «гульнятэрапія». Асноўныя этапы развіцця метаду гульнятэрапіі. Мэтавая аўдыторыя. Механізмы карэкцыйнага ўздзеяння гульні. Асноўныя паказанні да гульнятэрапіі (парушэнне росту «Я», нізкая ступень самаўспрымання, сумнеў і няўпэўненасць у магчымасці ўласнага асобаснага росту; высокая сацыяльная трывожнасць і варожасць у адносінах да навакольнага свету, эмацыянальная няўстойлівасць). Паказанні, супрацьпаказанні і абмежаванні ў гульнятэрапіі (сацыяльны інфантылізм, замкнёнасць, нетаварыскасць, фабічныя рэакцыі і да т. п.). Мэты ўстанаўлення абмежаванняў. Працэс устанаўлення абмежаванняў. Формы выказвання абмежаванняў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Агульныя абмежаванні. Супрацьпаказанні для індывідуальнай і групавой гульнятэрапіі.

### *Тэма 7. Асноўныя напрамкі, віды і формы гульнятэрапіі ў сістэме сацыяльна-культурнай рэабілітацыі*

Напрамкі ў гульнявой тэрапіі (бацькоўская тэрапія, гульнявая тэрапія з дарослымі, групавая гульнявая тэрапія, гульнявая тэрапія ў бальнічных умовах). Асноўныя віды і формы гульнятэрапіі. Функцыі дарослага ў гульнятэрапіі (недырэктыўная, дырэктыўная, змешаная гульнятэрапія). Формы арганізацыі гульнятэрапіі (індывідуальная, групавая). Адрозненні гульнятэрапіі па структуры выкарыстанага матэрыялу (з неструктураваным матэрыялам, са структураваным матэрыялам).

### *Тэма 8. Гульнятэрапія як сродак карэкцыі асобасных парушэнняў у сістэме сацыяльна-культурнай рэабілітацыі*

Карэкцыя ўзроўню дзіцячай трывожнасці з дапамогай недырэктыўнага, дырэктыўнага і змешанага метадаў гульнявой тэрапіі. Віды гульняў (ролевыя гульні, рухомыя гульні, гульні-драматызацыі). Гульні для дзяцей з сіндромам гіперактыўнасці. Гульні на трэніроўку ўседлівасці (якія не патрабуюць напружання, актыўнай увагі і дапускаюць праявы імпульсіўнасці). Прынцыпы ажыццяўлення гульнятэрапіі пры карэкцыі агрэсіўнасці. Асаблівасці недырэктыўнай і дырэктыўнай гульнявой карэкцыі эмацыянальных і асобасных парушэнняў у падлеткавым і юнацкім узросце. Асноўныя паказчыкі для правядзення індывідуальнай і групавой гульнявой карэкцыі. Патрабаванні да складу групы гульнявой карэкцыі. Гульнятэрапія як сродак сацыяльнай адаптацыі (школьная адаптацыя з дапамогай гульні). Гульнятэрапія як сродак развіцця міжасобасных адносін у старэйшых падлеткаў; сацыяльна-псіхалагічная адаптацыя пажылых людзей.

### *Тэма 9. Гульнятэрапія ў сістэме сацыяльна-культурнай рэабілітацыі дарослага насельніцтва*

Карэкцыя сямейных канфліктаў пры дапамозе гульнятэрапіі. Прайграванне сямейных роляў. Гульнятэрапія як метад карэкцыі дзіцяча-бацькоўскіх адносін. Гульнятэрапія для пажылых людзей.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Кіруемая самастойная работа | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|
| | | лекцыі | лабараторныя заняткі | | |
| **Раздзел 1. Арт-тэрапія** | | | | | |
| 1 | Тэарэтычныя асновы сацыяльна-культурнай рэабілітацыі | 2 | 2 | | |
| 2 | Арт-тэрапеўтычныя тэхналогіі ў сістэме сацыяльна-культурнай рэабілітацыі. Асноўныя паняцці, мэты і задачы арт-тэрапіі | 4 | 6 | 2 | абарона рэфератаў |
| 3 | Арганізацыя арт-тэрапеўтычнай работы спецыялістамі сацыяльна-культурнай дзейнасці | 2 | 6 | 4 | распрацоўка карэкцыйнага занятку |
| **Раздзел 2. Драматэрапія** | | | | | |
| 4 | Драматэрапія ў кантэксце сацыяльна-культурнай рэабілітацыі | 2 | 10 | 4 | выступленне на занятку |
| 5 | Казкатэрапія і «storytelling» у рабоце спецыяліста сацыяльна-культурнай дзейнасці з рознымі катэгорыямі насельніцтва | 2 | 12 | 4 | падрыхтаваць аналіз казкі |
| **Раздзел 3. Гульнятэрапія** | | | | | |
| 6 | З гісторыі гульнятэрапіі. Агульная характарыстыка гульнятэрапіі як сродку сацыякультурнай рэабілітацыі | 2 | 4 | 2 | абарона рэфератаў |
| 7 | Асноўныя напрамкі, віды і формы гульнятэрапіі ў сістэме сацыяльна-культурнай рэабілітацыі | 2 | 8 | 2 | выступленне на занятку |
| 8 | Гульнятэрапія як сродак карэкцыі асобасных парушэнняў у сістэме сацыяльна-культурнай рэабілітацыі | | 14 | 2 | выступленне на занятку |
| 9 | Гульнятэрапія ў сістэме сацыяльна-культурнай рэабілітацыі дарослага насельніцтва | | 4 | 2 | выступленне на занятку |
| | **Усяго…** | **16** | **66** | **22** | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ**
**(для студэнтаў завочнай формы навучання)**

| Нумар тэмы | Назва тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | |
|---|---|---|---|
| | | лекцыі | лабараторныя заняткі |
| 1 | Тэарэтычныя асновы сацыяльна-культурнай рэабілітацыі | 2 | |
| 2 | Драматэрапія ў кантэксце сацыяльна-культурнай рэабілітацыі | 2 | 2 |
| 5 | Казкатэрапія і «storytelling» у рабоце спецыяліста сацыяльна-культурнай дзейнасці з рознымі катэгорыямі насельніцтва | | 6 |
| 6 | З гісторыі гульнятэрапіі. Агульная характарыстыка гульнятэрапіі як сродку сацыякультурнай рэабілітацыі | 2 | |
| 7 | Асноўныя напрамкі, віды і формы гульнятэрапіі ў сістэме сацыяльна-культурнай рэабілітацыі | | 4 |
| 8 | Гульнятэрапія як сродак карэкцыі асобасных парушэнняў у сістэме сацыяльна-культурнай рэабілітацыі | | 6 |
| 9 | Гульнятэрапія ў сістэме сацыяльна-культурнай рэабілітацыі дарослага насельніцтва | | 4 |
| | **Усяго…** | **6** | **22** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура


*Асноўная*

1. *Большаков, В. Ю.* Психотренинг. Социодинамика. Игры. Упражнения / В. Ю. Большаков. – СПб. : Служба доверия, 1994. – 317 с.

2. Игровая терапия как метод интеграции и реабилитации : учеб. пособие : пер. с нем. / Бюро ЮНЕСКО в Москве, Герм. орг. «Развитие детей-инвалидов посредством игр и игрушек». – М. : Права человека, 2001. – 85, [1] с.

3. Игровая терапия с тревожными детьми / Л. М. Костина. – СПб. : Речь, 2001. – 159, [1] с. – (Детская психология и психотерапия).

4. Игровая терапия. Совсем не детские проблемы / С. И. Заморев. – СПб. : Речь, 2002. – 133, [2] с. – (Креативная терапия).

5. *Копытин, А. И.* Теория и практика арт-терапии / А. И. Копытин. – СПб. ; и др. : Питер, 2002. – 368 с.

6. *Лебедева, Л. Д.* Практика арт-терапии: подходы, диагностика, система занятий / Л. Д. Лебедева. – СПб. : Речь, 2003.

7. *Лэндрет, Гарри Л.* Игровая терапия: искусство отношений / Гарри Л. Лэндрет ; пер. с англ. Л. Р. Мошинской ; предисл. А. Я. Варга. – 1994.

8. Технология социально-культурной деятельности : учеб.-метод. пособие / Л. И. Козловская [и др.] ; М-во культуры Респ. Беларусь, Белорус. гос. ун-т культуры и искусств. – Минск : БГУКИ, 2014. – 206 с.

*Дадатковая*

1. Артпедагогика и арттерапия в специальном образовании : учебник для студентов средн. и высш. пед. учеб. заведений / Е. А. Медведева, И. Ю. Левченко, Л. Н. Комиссарова, Т. А. Добровольская. – М. : Академия, 2001. – 248 с.

2. *Дженнингс, С.* Сны, маски и образы : практикум по арт-терапии / С. Дженнингс, А. Минде. – М. : Эксмо, 2003. – 384 с.

3. Игра – ключ к душе ребенка: гармонизация отношений ребенка с окружающим миром: метод. пособие / Г. И. Репринцева. – М. : Форум, 2012. – 235 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*4.* Игра в семейной терапии : пер. с англ. / Элиана Джил. – М. : Эксмо, 2003. – 286, [1] с. – (Психологическая коллекция).

*5.* Игротерапия общения: тесты и коррекционные игры : практ. пособие для психологов, педагогов и родителей / М. А. Панфилова. – М. : Гном и Д, 2001. – 155, [1] с. – (Серия «В помощь психологу»).

*6. Киселева, М. В.* Арт-терапия в практической психологии и социальной работе / М. В. Киселева. – СПб., 2007. – 330 с.

*7. Копытин, А. И.* Арт-терапия для детей и подростков / А. И. Копытин. – М., 2007. – 196 с.

*8. Крюкова, С. В.* Удивляюсь, злюсь, боюсь, хвастаюсь и радуюсь: Эмоциональное развитие детей дошкольного и младшего школьного возраста / С. В. Крюкова, Н. П. Слободяник. – М. : Генезис, 1999. – 202 с.

*9.* Нарушения внимания у детей: тренинг и развивающие игры : пер. с нем. / Г. В. Лаут, П. Ф. Шлоттке. – М. : Академия, 2008. – 364, [1] с.

*10. Погосова, Н. М.* Цветовой игротренинг / Н. М. Погосова. – СПб. : Речь, 2002. – 152 с.

*11. Эстес, К. П.* Бегущая с волками. Женский архетип в мифах и сказаниях / К. П. Эстес. – М. : София, 2007. – 448 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Рэкамендаваныя сродкі дыягностыкі

Для выяўлення ўзроўню вучэбных дасягненняў студэнтаў рэкамендуецца выкарыстоўваць дыягнастычны інструментарый, якія мае рознаўзроўневы характар і рэалізуецца комплексна. У якасці такіх сродкаў кантролю і ацэнкі ведаў па вучэбнай дысцыпліне «Сацыяльна-культурная рэабілітацыя» могуць выкарыстоўвацца вусныя апытанні падчас заняткаў, складанне рэфератаў па тэмах вучэбнай дысцыпліны і выступленне студэнтаў на семінарскіх і практычных занятках з распрацаванымі структурамі арт-тэрапеўтычных заняткаў.

Для вымярэння ступені адпаведнасці вучэбных дасягненняў студэнта патрабаванням адукацыйнага стандарту таксама рэкамендавана выкарыстанне праблемных, творчых заданняў (напрыклад, распрацоўка карэкцыйных праграм сродкамі арт-тэрапіі).

## Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў

Самастойная работа студэнтаў з’яўляецца часткай вучэбнай дзейнасці і мае мэтай замацаванне і паглыбленне атрыманых ведаў і навыкаў, самастойны пошук і набыццё новых ведаў. Яна арыентавана на фарміраванне навыкаў самастойнай працы ў вучэбнай, навуковай, прафесійнай дзейнасці.

Самастойная работа студэнтаў уключае работу з лекцыйным матэрыялам, нарматыўна-прававымі і вучэбна-метадычнымі дакументамі, пошук і аналіз дадатковай літаратуры па тэмах вучэбнай дысцыпліны, вывучэнне тэм, вынесеных на самастойную падрыхтоўку, а таксама выкананне вучэбных заданняў, падрыхтоўку да практычных заняткаў і заліку па дысцыпліне.

## Прыкладны пералік заданняў для кіруемай самастойнай работы студэнтаў

1. Падрыхтоўка мультымедыйных матэрыялаў да дакладаў і рэфератаў.
2. Пошук і адбор рэабілітацыйных методык для вырашэння тых ці іншых эмацыянальных праблем асобы.
3. Падрыхтоўка да выканання дыягнастычных форм кантролю (вусных і пісьмовых апытанняў, тэстаў і інш.).
4. Падрыхтоўка рэфератаў.
5. Падбор гульняў для карэкцыйных заняткаў.
6. Распрацоўка карэкцыйных заняткаў.
7. Падрыхтоўка разгорнутага аналізу дыягнастычнага і тэрапеўтычнага патэнцыялу абранай казкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

# САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНАЯ РЭАБІЛІТАЦЫЯ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-23 01 14 Сацыяльна-культурная дзейнасць*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар А. У. Гіцкая

Падпісана ў друк 2019. Фармат 60x84 $^1/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 0,82. Ул.-выд. арк. 0,49. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ